# КУЛЬТУРНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў ГАЗЕЦЕ «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА» (па матэрыялах 1980–1990-х гг.)

**А. Р. Чачура**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*chechura_grigori@mail.ru,*
*навуковы кіраўнік – Н. А. Зубчонак, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У працы разгледжана культурная праблематыка газеты «Чырвоная змена» за 1980–1990-я гады, прадэманстраваны тэмы, якім былі прысвечаны публікацыі культурнага напрамку. Праведзены аналіз дае падставы сцвярджаць, што тэма культуры была ў ліку прыярытэтных.

***Ключавыя словы:*** газета «Чырвоная змена»; культурная праблематыка; мова; літаратура; гісторыя.

Тэма культуры ў журналістыцы з'яўляецца яе неад'емнай часткай. Як пісаў Ю. М. Лотман, «Культура з'яўляецца памяццю, яна ёсць запіс перажытага грамадствам у мінулым і звязана з узнаўленнем і асэнсаваннем яго гістарычнага вопыту» [1]. Яна заўсёды накіравана супраць забыцця.

Культура дапамагае прыняць «удары» часу і мякка дэманструе самыя набалелыя падзеі. Дапамагае паказаць даўно схаванае і забароненае. Добрая дэманстрацыя культурнага жыцця краіны і яе традыцый, чалавечых каштоўнасцей садзейнічае духоўнаму развіццю народа. Выхаванне патрыятызму, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, грамадзянская адказнасць – усё гэта галоўныя прыярытэты культуры. І менавіта ў багатай гістарычнай скарбонцы захавалася гісторыя камсамола, гісторыя перыяду СССР. Культура дапамагала моладзі духоўна развівацца. Культурную праблематыку 1980–1990-х гадоў мы разгледзім на матэрыялах газеты «Чырвоная змена».

Першы нумар газеты выйшаў у красавіку 1921 года. Да 1925 года яна выходзіла на рускай мове пад назвай «Красная смена». Пасля газета друкавалася на беларускай і рускай мовах. Выданне з'явілася ў складаных умовах: пасвялаваенны час, новая эканамічная палітыка, распрацоўка нацыянальнай палітыкі. Газета выходзіла фарматам А3, тыражом у 3 тыс. экзэмпляраў. Аб'ём выдання вагаўся ад чатырох да шасці палос. Першапачатковай мэтай выдання было ўсебаковае асвятленне дзейнасці

бальшавіцкай партыі і камсамольскіх арганізацый. Нягледзячы на гэта, на старонках маладзёжнага выдання было шмат культуралагічных і літаратурных матэрыялаў, якія перадавалі асноўныя праблемы часу.

У газеце публікавалася шмат твораў маладых аўтараў, «Чырвоная змена» рэгулярна выпускала літаратурную старонку, давала парады пачаткоўцам. Літаратура і культура з'яўляліся галоўнымі тэмамі, якія закраналі многія аспекты жыцця.

Праблематыка 1980–1990-х гадоў ахоплівае розныя тэмы: Афганская вайна, Вялікая Айчынная вайна, недахоп маладога пакалення ў рэдакцыях газет, статус беларускай мовы і іншае. І такі выбар тэм не дзіўны, менавіта ў гэты перыяд у гісторыі СССР адбыліся кардынальныя змены. Напрыклад, у гэты перыяд закончылася «халодная вайна» і пачаўся распад сацыялістычнага лагера. Таксама праходзіла перабудова ў СССР і здарылася катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.

Так, у газеце «Чырвоная змена» ад 26 чэрвеня 1986 года (№ 122) выйшла публікацыя пад назвай «Павышаць грамадскую аддачу літаратуры». У артыкуле чытачам паведамлялі, якія дыскусіі прайшлі на VIII з'ездзе пісьменнікаў СССР. «Перад савецкімі пісьменнікамі стаіць задача паўней, ярчэй распавядаць пра людзей, у якіх раскрываецца вышыня сацыялістычнай маралі, сталасць мыслення, перавагі Савецкага ўкладу жыцця», – так адзначыў адзін з выступоўцаў. Таксама выказвалася заклапочанасць праблемай, якая ўзнікла ў 1980-я гады. А менавіта «старасць» кадраў у літаратуры: «Наўрад ці можна прызнаць нармальным той факт, што многія пісьменніцкія арганізацыі амаль не папаўняюцца маладымі сіламі» [2].

Аналіз зместу газеты «Чырвоная змена» за гэтыя гады паказвае, што адной з самых пашыраных тэм была вайна. І калі матэрыялы пра Вялікую Айчынную вайну не выклікаюць здзіўлення, то матэрыялы пра Афганскую вайну, якая праходзіла ў 1979–1989-я гады і ў якой удзельнічалі савецкія салдаты, выклікаюць пытанні. Гістарычна вядомы факт, што ўлады імкнуліся мінімізаваць падачу і распаўсюджванне інфармацыі пра трагічныя падзеі. Гэта тычылася і развітання з забітымі, якое да 1987 года праходзіла ў паўтайне, а на помніках забаранялася пісаць, што салдат загінуў у Афганістане.

Але ў нумары газеты «Чырвоная змена» ад 29 чэрвеня 1986 года (№ 124) быў апублікаваны нарыс штатнага журналіста газеты В. Шаўко «Салдацкае поле». У нарысе аўтар распавядае пра салдата Сашку, які вярнуўся з афганскай вайны. «Салдат доўга не можа надыхацца спакоем, які ідзе ад мірнай зямлі» [3], – так апісвае аўтар жыццё салдата пасля вяртання з вайны. Праз гісторыю Аляксандра аўтар распавядае гісторыю батальёна,

у якім служыў салдат. Распавядае пра жахі, якія бачыліся на вайне, і пра тое, якім жыццё стала пасля вяртання. Гісторыя жыцця «да» і «пасля».

Яшчэ адным немалаважным фактам з'яўляецца публікацыя апавядання «Кветкі памяці» Анатоля Жалязоўскага. Публікацыя твора была падзелена на два выпускі (№ 121 і № 122). У апавяданні ўзнята вельмі важная тэма – салдаты, якія загінулі змагаючыся, але пра якіх нічога не вядома. «Факт гібелі вашага мужа не ўстаноўлены... а сын таксама загінуў пры складаных абставінах...» [4]. У аповедзе гаворка таксама ідзе пра салдат Афганскай вайны і пра тое, як хавалася інфармацыя нават ад родных. Пазней адзін з тых, хто ваяваў, расказаў гісторыю, як загінуў сын гераіні. Загінуў героем, але пра яго ніхто не ведае, нават уласная маці. У гэтай публікацыі ёсць добры выраз, які паказвае характар таго, што адбывалася ў тыя часы «не ўсе тыя героі, пра каторых пішуць» [4].

У 1990-х гадах у газеце сталі публікавацца матэрыялы, якія ў большай ступені былі прысвечаны гісторыі Беларусі і палітычным падзеям, якія на той момант адбываліся ў краіне. Так у пераломны момант гісторыі праз прызму культуры адбіваліся важнейшыя пытанні жыцця людзей і краіны у цэлым.

У нумары ад 17 снежня 1998 года выйшаў матэрыял пад назвай «Мова не павінна быць у апазіцыі». Галоўнай тэмай размовы са старшынёй Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, паэтам Генадзем Бураўкіным стала родная мова. А менавіта яе статус і тое, як людзі ставяцца да яе. Паэт быў занепакоены становішчам беларускай мовы. «Роўнасць моў – гэта іх роўнасць ва ўсіх сферах жыцця. Гэта аднолькавая павага і аднолькавая падтрымка дзяржавай абедзвюх моў на ўсіх узроўнях – школах, ВНУ, урадавых інстытутаў, навукоўцамі, суд і г. д. А што мы бачым на самай справе? Парламент наш працуе практычна толькі на рускай мове, большасць міністэрстваў, судоў – таксама», – менавіта так перадавалася ў матэрыяле думка паэта пра тое, ці існавала на той момант раўнапраўе моў [5].

У разглядаемы перыяд сталі выходзіць дакументальныя фільмы пра вядомых асоб, партыйных дзеячаў, пра гэта таксама пісалі журналісты газеты «Чырвоная змена». Прыкладам з'яўляецца матэрыял у нумары ад 10 снежня 1998 года пад назвай «Я не шкадую аб страчаным здароўі...». Гаворка ідзе аб здымках дакументальнага фільма «Беларусь была яго лёсам» пра Пятра Міронавіча Машэрава.

Такім чынам, аналіз матэрыялаў газеты «Чырвоная змена» дае падставы сцвярджаць, што тэма культуры на яе старонках была ў ліку прыярытэтных. Пачынаючы з 1980-х гадоў сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку і газета

«Чырвоная змена», публікавалі матэрыялы, тэматыка якіх была забароненая да гэтых гадоў. Культурную праблематыку складалі ваенныя тэмы, праблемы беларускай мовы і літаратуры. На пераломе гісторыі менавіта дзякуючы газетам, якія публікавалі калісьці забароненыя тэмы, многія людзі сталі пераасэнсоўваць сваё мінулае, мінулае сваёй Радзімы.

У чым жа каштоўнасць культуры для жыцця сучаснага чалавека? Культура дапамагае па-іншаму глядзець на свет і па-іншаму разумець яго. Культура прасвятляе чалавека і паказвае тое, што на першы погляд заўважыць складана. Праз культуру можна перадаць тое, што складана сказаць і апісаць. Культура дапамагае жыць.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Лотман Ю. М*. Беседы о русской культуре: Быт и традиции русскогодворянства (XVIII – начало XIX века). Искусство. СПб. 1994. 399 с.
2. Павышаць грамадскую аддачу літаратуры // Чырвоная змена. 1986. № 122.
3. *Шаўко В*. Салдацкае поле // Чырвоная змена. 1986. № 124.
4. *Жалязоўскі А*. Кветкі памяці // Чырвоная змена. 1986. № 121–122.
5. Мова не павінна быць у апазіцыі // Чырвоная змена. 1998.